# Фрагмент абраду “Вячоркі”

І.М.Пікта, кіраўнік дзіцячага фальклорнага калектыву “Забаўлянка”
І.П.Талкач, кіраўнік аб’яднання па інтарэсах “Наша спадчына”

**Мэта:** Выхоўваць у вучняў шаноўныя адносіны да мінулага да нашых продкаў;
Развіваць цікавасць да традыцый роднага краю;
Развіват творчыя здольнасці;
Вучыць дзяцей слухаць і разумець беларускую мову.

**Дзеючыя асобы:**
**Абсталяванне:** зала афармлена пад сялянскую хату, на сталах гліна, саломка, кускі нітак, прасніца, ежа (бульба, агуркі, сала, пірог).

*(Гаспадар пляце кошык. Гаспадыня мяце хату)*
**Гаспадыня:**
Рыгор, кідай ты ўжо свой гэты кошык, хопіць ужо мне тут смяціць. Людзі зараз прыйдуць.
**Гаспадар:** Не крычы, яшчэ трохі засталося.
**Гаспадыня:** А ў цябе заўсёды часу не хапае, кідай!
*(У гэты час чуецца стук у дзверы. Заходзіць Кума.)*
**Кума.** Вечар добры, кума! Гляджу, яшчэ і не прыбралася. Хоць хвартух памяняй.Ужо чула за вулачкай хлопцы з дзеўкамі збіраюцца. (*да гаспадара*) Ой, а Рыгор ужо прыбраўся, і сарочку бялюткую надзеў. Добры вечар, кумочак! Як здароўечка?!
**Гаспадыня** (убок) Во дзе ядаўка!
**Гаспадар.** Дзякаваць Богу, Кумачка.
*(Шум, рогат, заходзіць моладзь)*
**Госць:**
Добры вечар у хату,
Шчыра вас вітаем,
Добрага здароўя шчыра вам жадаем!
Ці можна да вас на вячоркі?
**Гаспадыня:**
Міласці просім да нас у госці!
Вячоркі чакаюць гасцей.
Заходзцьце, заходзьце, хутчэй!
**Гаспадар:**
У нашай хаце госцем будзь.
Танцуй, спявай, бяду забудзь
Пра весялосць не забывайся.
У працы, танцах ты старайся!
**Госці:** - Сядзем радком, пагаворым ладком.
- За добрай размовай і работа ідзе хутчэй.

*Пад гучанне беларускай народнай музыкі (полечка). Госці садзяцца на лавы і пачынаюць працаваць.*

**Гаспадыня:** Ну, людцы, раскажыце, дзе былі, што бачылі, што чулі.
**Госць 1**: Многа хадзілі, шмат лапцяў стапталі. Многа гісторый розных чулі, адразу і не прыпомніш.
**Кума**: А вы сядзьце, адпачніце, што чулі, тое і раскажыце.
**Госця 2**: Ды што тут яшчэ скажаш. Уся вёска гаворыць, хіба вы не чулі?
**Гаспадары**: Не, не чулі. А дзе што нарабілася?
**Госця:** Ой, уся вёска гудзе! Гэта ж Наста Паўлючкава з Лёлькай Панічовай за курыцы сварыліся. Аж валасы адна адной павырывалі.

*Усе рагочуць.*

**Гаспадар**: Не былі б то бабы!
**Гаспадыня**: Вот, сціхні. Лепш прынёс бы чаго, пачаставаў гасцей. Яблыкаў мочаных, грушак, узвару, кваску прынясі. А я па печыва схаджу. А вы паспявайце, дзяўчаткі.

*Песня "За сонцам не бачу"*

За сонцам не бачу
За ветрам не чую
За нядобрым мужам
Дома не начую.

Пусці, мяне мужа
У сад, у садочак
У сад у садочак
Набраць ягадочак.

Пусці мане мужа
Да броду па воду
Да броду па воду
Да роднага роду.

Не пушчу цябе я
Да броду па воду
Бо ты ўсё раскажаш
Пра нашу няўзгоду

Не буду, мой мілы
Не буду казаці
Як слёзы пальюцца
То выйду я с хаты.

За сонцам не бачу
За ветрам не чую
За нядобрым мужам
Дома не начую.

**Гаспадыня:** Яж хораша спяваеце! Аж на слязу прабілі! Дзяўчаткі, давайце што весялейшае, а то хлопцы прымлелі!
**Хлопец**: Лепш станцуем!
**Хлопец**: А што будзем танцаваць?
**Хлопец**: Давайце “Лысага” урэжам!

*Танец “А чаму ж ты лысы”*

**Гаспадыня**: Пачастуйцеся, госцікі. Перакусіце, чарвячка замарыце, каб добра ногі скакалі.
*(Госці частуюцца, дзякуюць за пачастункі, хваляць квасок, печыва. Пачынаюць спяваць)*

*Песня “Пад’язжаем мы да сяла” (Гродзенскае Панямонне)*

Пад’язжаем мы да сяла
Зайграй, дудачка весела
Зайграй, дудачка весела
Каб наша сяло весела было.

Каб наша сяло весела было.
Каб наш каравай зелен быў
Каб наш каравай зелен быў
Каб наш малады весел быў

Каб наш малады весел быў
Да сябе ён дзеваньку ўзяў
Хадзі дзеванька да мяне
Будзеш жонкаю для мяне

Пад’язжаем мы да сяла
Зайграй, дудачка весела
Зайграй, дудачка весела
Каб наша сяло весела было.

**Хлопец**: Полька!

*Танец “Полька па-кругу”*

**Дзяўчына**: Цётачка Марыля, паспявайце. Усе ў вёсцы ведаюць, як вы прыгожа спяваеце.
**Усе**: Паспявайце, паспявайце.
**Гаспадыня**. Добра, угаварылі. Толькі вы мне памагайце.
**Гаспадар**: Заспяваем, Марылька, нашу любімую. Пра салаўя.

*Песня “Да касіў бацька,касіў я” (Гродзенскае Панямонне)*

Да касіў бацька, касіў я
Дай выкосілі салаўя

Салавей у саду цёёг даа цёог
Канарэечкаааа
Роман косікам да вяжа
Кацярына загрэбае
Грыцька волы напаіў
Ганна воду цягала
Ой, мама, люблю Грыця
Грыць на коніку вярціцца
Грыцю шапка да ліца
Люблю Грыця малайца

Да прыйдзе грыцю ў нядзелю
Дам сарочку, што накоой белу.

Да прыйдзе Грыцю ў панядзелак
Пойдзем разам па бярвенак.

Да прыйдзе Грыцю ў аўторак
Да мы звяжам снапоў сорак

Не, не пайду

Салавей у саду цёёг даа цёог
Канарэечкаааа
Роман косікам да вяжа
Кацярына загрэбае
Грыцька волы напаіў
Ганна воду цягала
Ой, мама, люблю Грыця
Грыць на коніку вярціцца
Грыцю шапка да ліца
Люблю Грыця малайца!
Усё!

**Хлопец:**

Проста і для ўцехі пачынаюцца пацехі.

**Кума:**

Сення я прапаную спаборніцтва. Паглядзім, хто больш кемліва, хто больш загадак ведае, хлопцы ці дзяўчаты. Гульня “Сценка на сценку”. Танцаваць то вы ўмееце добра!

А паспрабуйце адгадаць нашы загадкі!

**Гаспадар:** Што, хлопцы, справімся?

**Хлопцы:** Справімся!

(загадваюць загадкі па чарзе)

1.Чым больш я кручуся, тым больш таўсцею (клубок нітак)

2.Новая пасудзіна, а ў дзірачках (рэшата).

3.Чорны конь лезе ў агонь (качарга).
4. Цягнецца нітка, а на клубок не зматана (дарога).
5. Жывуць браты, за гарбом крутым, разам смяюцца і плачуць, адзін Аднаго не бачаць (вочы).
6. Без рук, без ног, а па падлозе скача (венік).
7. Зубаты, а не кусаецца. Што гэта? (граблі).
8. Маленькі, гарбаценькі, усё поле абскакаў (серп).
9. Кругленькі, маленькі, а за хвост не падняць (клубок).
10.Чым больш крчуся, тым больш таўсцею (верацяно).
11. Стаіць на гары, крыламі махае, супраць ветру грудзі падстаўляе(вятрак).
12. Круціцца, верціцца цэлы век, а не чалавек (млын).

**Кума:** Закідалі вы нас загадкамі. Хіба начамі не спіце, а ўсё кніжкі чытаеце? Ой, малайцы! Пацешылі, павесялілі! Што ж дзяўчаткі, адкуплівайцеся!

*Песня “Ох і сеяла Ульяніца лянок”*

Ох і сеяла Ульяніца лянок
Ох і сеяла Іванаўна лянок

Ох, сэрца – лянок
Мая радасць ты лянок
Усё бялюсенькі кужалёк.

**Гаспадар**: Далучайцеся, хлопцы, да дзяўчат. Засядзеліся, пэўна, на лавах.

**Хлопец**: Музыкант, зайграй “На рэчаньку”!

*Танец “На рэчаньку”*

*(Запрашаюцца госці патанцаваць )*